M05/1/A1BEL/SP1/BEL/TZ0/XX

22050027

**BELARUSSIAN A1 – STANDARD LEVEL – PAPER 1**
**BIÉLORUSSE A1 – NIVEAU MOYEN – ÉPREUVE 1**
**BIELORRUSO A1 – NIVEL MEDIO – PRUEBA 1**

Tuesday 3 May 2005 (morning)
Mardi 3 mai 2005 (matin)
Martes 3 de mayo de 2005 (mañana)

1 hour 30 minutes / 1 heure 30 minutes / 1 hora 30 minutos

INSTRUCTIONS TO CANDIDATES

- Do not open this examination paper until instructed to do so.
- Write a commentary on one passage only. It is not compulsory for you to respond directly to the guiding questions provided. However, you may use them if you wish.

INSTRUCTIONS DESTINÉES AUX CANDIDATS

- N'ouvrez pas cette épreuve avant d'y être autorisé(e).
- Rédigez un commentaire sur un seul des passages. Le commentaire ne doit pas nécessairement répondre aux questions d'orientation fournies. Vous pouvez toutefois les utiliser si vous le désirez.

INSTRUCCIONES PARA LOS ALUMNOS

- No abra esta prueba hasta que se lo autoricen.
- Escriba un comentario sobre un solo fragmento. No es obligatorio responder directamente a las preguntas que se ofrecen a modo de guía. Sin embargo, puede usarlas si lo desea.

Напішыце каментарый да **аднаго** з наступных тэкстаў:

**1.** (a)

Асенняе.

Чаго душа мая шчыміць,
Не ведаю:
Ці ад таго,
Што нецікава жыць,
Ці ад таго,
Што неба сёння бледнае
І ліст апошні за акном дрыжыць.

А, можа, ад таго,
Што шмат растрачана
І быльнягом счарнелым зарасло,
Што з памяці сплывае ўсмешка матчына
І жураўля спазнелага крыло.

Забылася, схавалася пад верасам
Сцяжынка ля бацькоўскага двара.
І многія сябры мае не вернуцца
З дарогі той,
Куды і мне пара.

Не грэе сонца.
Горбяцца за крушнямі
Замшэлыя, цяжкія валуны.
Буслы зляцелі з балацін асушаных
І ўжо назад не прылецяць яны.

На хмаркі
Промні выцвілымі пасмамі
Кладуцца,
Каб сплываць за далягляд.
І толькі пазняцвет
Вачамі яснымі
Глядзіць,
Як і паўсотні год назад...

Генадзь Бураўкін. Паміж зоркай і свечкай. 2000

- Як у гэтым вершы паэт з вышыні пражытага і перажытага разважае над вечнымі пытаннямі жыцця і смерці?
- Як структура дапамагае перадаць глыбокую лірычнасць, шчырасць і ўзрушаннасць верша?
- Разгледзце як ўжыванне вобразных сродкаў перадае інтэсіўнасць пачуццяў паэта?
- Як на вашу думку, ці з' яўляецца гэты твор песімістычным?

**1.** (b)

Пасля трызненняў мінулых сутак мая свядомасць паступова, бы амёба, выбіралася на паверхню рэальнасці. Болю не было, засталося адчуванне, што вочы нібы вокны, якія густа прамытыя нейкай дезынфекцыйнай вадкасцю, і таму сусвет зрабіўся занадта каляровым, штучным...

Ложак стаяў насупраць вялікага, нейкага непатрэбна-акварыўмнага акна. Нават праз белыя сцены рэанімацыйнай палаты, яе ненатуральную цішыню (электроніка, якая шыпела, мігала і пікала ўсю ноч, ратуючы мне жыццё, - была зараз адключаная) адчувалася, што на дварэ пануе недарэчная лютаўская адліга.

Мая галава была павернута да акна, вочы ўпіраліся у неба. На фоне празрыстага, амаль бясколерна-блакітнаватага квадрата калыхалася вершаліна ўзмакрэлай у нечаканым цяпле туі. На ёй, бы палымяныя жаноцкія каралі, гойдаліся амялушкі. Чамусьці ўспомнілася, што ў дзяцінстве амялушкі заўсёды нагадвалі мне чырвоныя велікодныя яйкі. Здавалася, што і птушаняты ў іх з' яуляюцца менавіта з такіх вясёлкава-сонечных яек...

Глядзець на птушак было балюча, іх калярова-рахманая мітусня выклікала незразумелую расчуленасць, макрэлі вочы, але я не магла дазволіць сабе слёз. Утрымліваючы свядомасць, якая нацягвалася, бы пасак, пагражаючы парвацца, я адчувала, што вар' яцтва паглыне мяне, што я магу зламацца... Не, я не магла дазволіць сабе слёз, нават калі гэта б былі проста слёзы ад сонечнага святла.

Дурнаваты жарт зрабілі са мной наркатычныя лекі: яны пазбавілі болю, але абвастрылі ўспрыняцце, неяк скасабочылі яго. Лепей бы балела, можа, тады не думаецца

Гадзіну таму (я не ведала часу, але гэта было на досвітку, здаецца) да мяне завітаў хірург, які рабіў аперацыю, і анестэзіёлаг, малады, зграбны хлопец. Росту ён быў сярэдняга, але побач з веліканам-хірургам глядзеўся падлеткам. Яны нічога не пыталіся, а я заплюшчыла вочы, мне было ўсё роўна...

Санітарка яшчэ не бачыла, што кашуля на мне разарваная амаль данізу, а прасціны брудныя ад крыві. Гэта неістотна, гэта потым.

Нячутна падыйшла дзяжурная сястра, новая, не тая, не ўчарашняя. Праз сутонне трызненняў я запомніла іншы твар. Заўсёды ён будзе з' яўляцца да мяне, бы твар анёла-ахоўніка, а можа, як твар фізічнае пакуты...

Сённяшняя сястра апранута ў стэрыльны строй едкага зялёнага колеру. Яе рухі здаваліся нервовымі і непрыгожымі. Я зноў апусціла павекі Гэта адзінае, што я магла зрабіць з ранейшай зграбнасцю. Хацелася набраць у грудзі паветра, пацягнуцца ўсім целам, адчуць яго моц, дотык прасціны, аконны скразняк, рыпенне ложка. Але цела падавалася незнаёма вялікім, цяжкім, здавалася яно замінала маёй існасці перайсці у нейкі іншы, яшчэ невядомы мне стан, але абавязкова лёгкі, бруісты, бы пялёсткі белага дзьмухаўца...

Медыкі размаўлялі, седзячы ў куце пакоя. Я не чула ўсяго, але мая свядомасць, бы дзікая жывёліна, успрымала інфармацыю па калыханню паветра ці па толькі Богу вядомых каналах інтуіцыі. Словы, што цвікі, укрыжоўвалі маю збалелую душу, але я ведала ўсё і без слоу. Ведала, што дзіця памерла. Але яно ўжо назаўсёды - знітаваная са мной душа, кавалак мяне...

Зараз, адчуваючы нейкую ўнутраную сцішанасць, я стомлена ўзіралася ў празрысты квадрат. Гарэзліва мітусіліся амялушкі на заінелых вейках дрэва.

Прачнулася жанчына на суседнім ложку. Шырокі, крыху зацёклы і запалёны твар яна павярнула ў мой бок. Жанчына была ужо старая для парадзіхі і з-за высокага

крывянога ціску ледзь не страціла дзіця. Дзяўчынка нарадзілася кволая, але ўрачы запэўнівалі што будзе жыць.

Рот маёй суседкі не зачыняўся больш ні на імгненне. Здавалася, нехта б'е над маёй галавой у вялізны тамтам і ніякая сіла не можа спыніць глухое, бессэнсоўнае біццё. Гэта замінала думаць. Замінала глядзець у неба. На птушак, на зялёную лапу, якая трымала чырвоныя пацеркі - каралі жыцця.

Ганна Панамарэнка. Амялушкі. 2000

– Якія акалічнасці ў жыцці галоўнай дзеючай асобы паказаны ў гэтым творы?

– Якая роля адводзіцца аўтарам супрацьпастаўленню тэмы жыцця і смерці?

– Разгледзьце ролю і характар вобразных сродкаў у тэксце?

– Якое ўражанне зрабіў на вас гэты тэкст?